**ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

# Хроніка
# культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за лістапад 2022 г.

У рамках акцыі «Полезные каникулы» ў бібліятэках раёна прайшлі квест-гульні, конкурсы, віктарыны, пасяджэнні аматарскіх клубаў і шэраг іншых мерапыемстваў. З 30 кастрычніка па 7 лістапада 2022 года бібліятэкамі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» арганізавана 54 мерапрыемства для дзяцей і падлеткаў.

## Мерапрыемствы ў рамках Года гістарычнай памяці і раённага краязнаўчага месячніка « Чытаючы Радзімы старонкі »

**1 лістапада**

Удзельнікамі краязнаўчай гадзіны славы і прызнання «Нашы землякі – наш гонар» сталі вучні сярэдняй школы № 4 г. Кобрына, члены школьнага этнаграфічнага музея «Родныя вытокі». Прадстаўлена слайд-прэзентацыя «Славутыя імёны маёй малой радзімы». Прысутныя пазнаёміліся з шэрагам знакамітых людзей кобрынскага краю, дасягненнямі вядомых землякоў, гісторыямі з іх жыцця; даведаліся аб краязнаўчым асветніцкім біябібліяграфічным праекце кобрынскай бібліятэкі. Асобным блокам прайшла рэклама бібліятэкі і яе паслуг, а таксама знаёмства з публічным цэнтрам прававой інфармацыі, які функцыянуе на базе цэнтральнай бібліятэкі і ў гэтым годзе адзначае 20-годдзе свайго існавання.

ЦРБ, 21 чал.

**4 лістапада**

З нагоды 140-гадовага юбілею Янкі Купалы і Якуба Коласа супрацоўнікі бібліятэцы сумесна з аддзелам кінаабслугоўвання «Кинотеатр «Радуга» правялі літаратурную гадзіну «Крыніца натхнення: Я. Купала і Я. Колас». Мерапрыемства адбылося ў рамках праекта «Книга в кадре». Бібліятэкары «правялі» вучняў па жыццёвых і творчых сцежках пісьменнікаў, нагадалі цікавыя звесткі з паўсядзённага жыцця песняроў. З уздымам прагучалі вершы «Мужык», «Белаю чаромхавай завеяй», «Наш родны край» і іншыя. Удзельнікі мерапрыемства пачулі нямала выказванняў пра творчасць знакамітых беларускіх песняроў, шчырых слоў удзячнасці за іх талент і працу. Завяршылася сустрэча праглядам фільма «Классики и шахматы».

ЦРБ, 122 чал.

**4 лістапада**

У бібліятэцы арганізаваны бібліяграфічны агляд каля выставы-партрэта «Анатоль Брытун: асоба, кнігі, лёс», прымеркаванай да 65-годдзя з дня нараджэння А. А. Брытуна, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэата літаратурнай прэміі імя Уладзіміра Калесніка, празаіка, публіцыста.

ЦРБ, 32 чал.

**10 лістапада**

Адбылося фальклорнае падарожжа «Урокі мудрасці жыццёвай далі нам у спадчыну бацькі», накіраванае на фармаванне цікавасці ў моладзі да гісторыі, культуры і фальклору беларусаў. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі навучэнцаў Кобрынскага палітэхнічнага каледжа з гісторыяй і традыцыямі роднага краю: народнымі святамі беларускага календара, традыцыйным народным беларускім адзеннем, у т. л. з кобрынскім строем жаночага касцюма - касцюмам свацці в. Лелікава, з нацыянальнай кухняй беларусаў. Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Да вытокаў народнай культуры».

ЦРБ, 29 чал.

**17 лістапада**

З нагоды 140-гадовага юбілею Янкі Купалы і Якуба Коласа бібліятэка правяла літаратурна-музычную кампазіцыю «Купала і Колас - народа душа і голас». Бібліятэкар распавяла вучням пра жыццёвы і творчы шлях пісьменнікаў, нагадала цікавыя звесткі з паўсядзённага жыцця песняроў, пазнаёміла з вершамі, якія сталі песнямі. Вучні чыталі вершы паэтаў «Ручэй», «Спадчына», «Мой родны кут, як ты мне мілы» і іншыя, удзельнічалі ў віктарыне «Па старонках жыцця і творчасці Купалы і Коласа». Да мерапрыемства аформлена кніжная выстава «Радзімы верныя сыны».

Лукская ПБ, 18 чал.

**<u>Мерапрыемствы ў рамках акцыі «Всемирный день некурения»</u>**

**17 лістапада**

У рамках праекта «Здаровая моладзь – здаровая нацыя» прайшла інфармацыйная гадзіна «Калі звычка прыводзіць да хваробы». Урач па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святлана Васільева расказала навучэнцам Кобрынскага палітэхнічнага каледжа аб таксічным уздзеянні кампанентаў тытунёвага дыму на здароўе чалавека, аб захворваннях, звязаных з курэннем. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі прысутных з людзьмі, якія памерлі ад хвароб, звязаных з курэннем. Асаблівую ўвагу надалі курэнню электронных цыгарэт. Падлеткі з цікавасцю адказвалі на пытанні віктарыны «Шлях да здароўя». Мерапрыемства суправаджалася відэапрэзентацыяй «Тихий убийца».

ЦРБ, 31 чал.

**17 лістапада**

Падчас правядзення гадзіны зносін «Полезный разговор о вредных привычках» дзеці даведаліся аб паходжанні тытуню, гісторыі яго з'яўлення ў краіне, пагаварылі аб дрэнных і добрых звычках, выявілі асноўныя прычыны шкоды нікацінавай залежнасці і зрабілі для сябе пэўныя высновы. Прысутныя адказвалі на пытанні віктарыны, складалі прыказкі з прапанаваных слоў, пазнаёміліся з кніжнай выставай «Табак– первое звено

опасной цепи». Мерапрыемства суправаджалася відэафрагментамі пра шкоду курэння.

Арэхаўская ПБ, 18 чал.

**17 лістапада**

Бібліятэкар правяла дыскусію «Жизнь без сигареты: поговорим о преимуществах» для навучэнцаў 9 класа. Вядучая азнаёміла Гарадзецкай сярэдняй школы з гісторыяй з'яўлення тытуню і цыгарэт і праінфармавала аб тым, колькі гіне людзей ад гэтай згубнай звычкі. Расказ суправаджаўся паказам відэапрэзентацыі «Вопрос – ответ».

Гарадзецкая ПБ, 15 чал.

**25 лістапада**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу праведзены раённы конкурс буклуков «Книжный натюрморт по имени «Память» з мэтай прыцягнення ўвагі да літаратуры, кніжнага мастацтва і кніжнай культуры ў Год гістарычнай памяці сродкамі фатаграфіі. У форме прэзентацыі прадстаўлены конкурсныя работы бібліятэкараў раёна. Шляхам агульнага галасавання вызначаны пераможцы. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў пройдзе ў снежні.

ЦБ, 29 чал.

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**4 лістапада**

Круглы стол "#СТОПНАРКОБИЗНЕС" пры ўдзеле першага сакратара Кобрынскага РК ГА "БРСМ" Марыны Бандарук, урача па медыцынскай прафілактыцы Кобрынскай ЦРБ Святланы Васільевай, начальніка інспекцыі па справах непаўналетніх Кобрынскага РАУС Ірыны Карповіч у рамках праекта "Здоровая молодёжь – здоровая нация" прайшоў для навучэнцаў УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» і УА «Кобрынскі дзяржаўны ліцэй сферы абслугоўвання». Запрошаныя спецыялісты правялі з навучэнцамі прафілактычную гутарку па тэме праблемы наркаманіі і незаконнага абароту наркатычных сродкаў. Пагаварылі аб адказнасці пры незаконным распаўсюджванні наркатычных сродкаў, аб згубным уплыве наркотыкаў на арганізм. Адмысловая ўвага нададзена выпадкам удзелу падлеткаў у распаўсюджванні наркатычных сродкаў праз сетку Інтэрнэт. Супрацоўнікі бібліятэкі пазнаёмілі юнакоў з вядомымі людзьмі, якія памерлі ад перадазіроўкі наркотыкамі. У ходзе гутаркі падлеткі зачыталі гісторыі нарказалежных людзей, прагледзелі ролікі антынаркатычнай накіраванасці.

У канцы мерапрыемства студэнтам уручаны інфармацыйныя буклеты, памяткі аб згубнасці наркаманіі.

ЦРБ, 61 чал.

**9 лістапада**

Падчас правядзення гістарычнай гадзіны «Октябрьская революция. Страницы истории» бібліятэкар расказала прысутным пра гісторыю святкавання 7 лістапада - Дня Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Дзеці даведаліся пра рэвалюцыянераў, пра тое, што імі кіраваў

Ленін, прагледзелі мультфільм «Орленок». У завяршэнне мерапрыемства бібліятэкар прапанавала дзіцячыя кнігі пра падзеі таго часу.

Кісялявецкая ПБ, 15 чал.

**18 лістапада**

Чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце літаратурнай гадзіны «В гостях у книги». Мерапрыемства была адзначана прэзентацыямі кніг, выдадзеных членамі клуба ў 2022 годзе. Гэта зборнік вершаў Міхаіла Крава «Этажи любовных сфер» і кніга пра вядомага шахматыста Уладзіміра Сайгіне «Семикратный», адным са складальнікаў якой з'яўляецца Сцяпан Давыдзюк. Паэты чыталі свае новыя вершы.

ЦРБ, 12 чал.

**25 лістапада**

У бібліятэцы прайшоў семінар–практыкум «Библиотечное обслуживание: актуальные вопросы, динамика изменений, поиск нового», удзельнікамі якога сталі бібліятэчныя работнікі горада і раёна. Дырэктар сістэмы падвяла вынікі дзейнасці бібліятэк за адзначаны перыяд, паставіла заданні на новы перыяд. Праведзены аналіз вядзення і запаўнення ўліковых формаў бібліятэчнай работы і інш. Прадстаўлена відэапрэзентацыя ў дапамогу планаванню «Планирование в библиотеке. Традиции и новации».

ЦРБ, 29 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81